ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
12
СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 34 (1484)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП

*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### НА ПАСЯДЖЭННІ ПРАФКОМА

універсітэта разглядалася пытанне «Аб рабоце вучэбна-навукова-вытворчых аб'яднанняў і філіялаў кафедраў фізічнага факультэта па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, укараненню навуковых распрацовак у святле новых задач навукова-тэхнічнага прагрэсу».

А. СОЧЫН.

### У ПАДРЫХТОЎЦЫ

тэлевізійнай праграмы «Мерыдыян» на рэспубліканскім тэлебачанні прынялі ўдзел студэнты IV курса факультэта журналістыкі Хасан Рабі і Набіль Альпатыб. Студэнты пераканаўча расказалі аб трагедыі арабскага народа Палесціны, аб яго цяжкім становішчы, аб нязломнай волі і барацьбе супраць прыгнятальнікаў.

Каментатары Беларускага тэлебачання выказалі падзяку студэнтам за дапамогу ў перадачы «Блізкі Усход — боль, надзеі і трывога».

М. НАДЭР, Н. КАЗЕМ,
студэнты факультэта журналістыкі.

### НА ПЕРШЫНСТВЕ

універсітэта па дзюдо ў праграме XXXIV спартакіяды выступілі 113 студэнтаў усіх факультэтаў. Сярод іх былі прызёры маладзёжнага першынства СССР, чэмпіёны БССР.

Вялікай папулярнасцю карыстаецца гэты від спорту сярод студэнтаў юрыдычнага факультэта. Яны і занялі першае каманднае месца. На другім месцы — фізічны факультэт, на трэцім — геаграфічны.

У асабістым заліку ў сваіх катэгорыях чэмпіёнамі універсітэта сталі Ю. Калараў, А. Ламакін, В. Матарас, Р. Срылкоў, Ю. Плаўсюк (юрфак), С. Крук (фізфак), А. Усоўскі (гістфак). Абсалютным чэмпіёнам стаў В. Матарас (юрфак).

М. БРЫТКОЎ,
галоўны суддзя турніру.

### АДБЫЛАСЯ ВУЧОБА

камсамольскага актыву універсітэта. Перад сакратарамі і намеснікамі сакратароў камсамольскіх арганізацый факультэтаў выступілі намеснік загадчыка аддзела ЦК КПБ В. П. Кузьмянкоў, сакратар ЦК ЛКСМБ А. П. Хандогін, дырэктар Інстытута філасофіі і права АН БССР Я. М. Бабосаў.

Ю. ВАРАТНІЦКІ.

### 20 СНЕЖНЯ

адбудзецца студэнцкая навуковая канферэнцыя па выніках першага тура XI Усесаюзнага конкурсу па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. У ёй прымуць удзел каля 350 савецкіх і замежных студэнтаў.

А. МАСЬКОВА.

## РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!

*ТОЕ, ШТО АЛЕНА ШПЕТ, студэнтка III курса сёмай групы ММФ педагагічнага патоку вучыцца на «выдатна» — не дзіўна. Яшчэ ў школьныя гады вырашыла яна стаць настаўніцай. Мара гэтая была не толькі марай. Дзяўчына пачала сур'ёзна рыхтавацца да паступлення ў ВНУ. Калі настаў час уступных экзаменаў, маці і бацька раілі дачцы паступаць толькі на вытворчы паток ММФ. Алена засталася неперакананай. І зараз яна ўпэўнена, што не памылілася. Па-ранейшаму захоплена сваёй будучай прафесіяй. І як вынік — яе паважаюць на курсе і факультэце. А яшчэ дзяўчына цвёрда ўпэўнена, што вучоба цесна павінна быць звязана з грамадскай працай. Яна — выдатны камсорг.*

*Фота і тэкст А. ВАЛОШЫНА.*



## ЖУРНАЛІСТ — ГЭТА НЕ ТОЛЬКІ...

### З КЛОПАТАМ АБ НОВЫМ ПАПАЎНЕННІ

КАЛІ ЗНАЁМЫЯ пытаюцца, чаму выбрала журфак, адказваю: зусім выпадкова. І гэта сапраўды так: ніколі не марыла пра доўгія дарогі, інтэрв'ю з зоркамі эстрады і кіно, не правярала сябе на вынослівасць і «прафесіянальную годнасць», як гэта рабілі некаторыя знаёмыя аднагодкі. Хацела «прозы жыцця» — марыла быць настаўніцай.

Але аднойчы трапіла ў рукі газета з аб'явай: «Школа юнага карэспандэнта пры факультэце журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна пачынае сваю работу». Гэтыя простыя словы здаліся тады амаль магічнымі. Вырашыла паглядзець, што гэта за школа такая. Угаварыла сяброўку і — пайшлі.

На факультэце спадабалася літаральна ўсё: вялікая актавая зала з прыстасаванымі да крэслаў дошчачкамі для запісу, вучэбныя тэле- і радыёстудыя, стэнды з фотаздымкамі студэнтаў, і асабліва — самі студэнты, вясёлыя і таварыскія...

Прайшлі гады. Я паступіла на журфак, і летась камітэт камсамола даверыў мне вельмі адказную «пасаду» — рэктара школы юнкораў, у якой цяпер ужо сама вяду заняткі са школьнікамі.

Мы ставім такую задачу: прыадкрыць заслону над нашай знешне цікавай, рамантычнай і даволі прэстыжнай прафесіяй, дапамагчы школьнікам убачыць за знешняй прывабнасцю сапраўдныя журналісцкія будні, выявіць людзей здольных, якія ўмеюць думаць і маюць уласны, нешаблонны позірк на тыя ці іншыя рэчы, даць ім магчымасць самім паспрабаваць сябе ў журналістыцы.

Летась на першыя заняткі прыйшло каля ста вучняў 8—10 класаў. Адразу правялі анкету «Чаму я хачу стаць журналістам?» Высветлілася, што многія, убачыўшы мастацкі фільм «Журналіст», марылі аб паездцы ў Парыж і Рыо-дэ-Жанейра, сустрэчах з «зоркамі» рознай велічыні... І толькі адзінкі (!) хацелі актыўна ўмешвацца ў жыццё, выкрываць недахопы, расказваць аб дасягненнях, паказваць рамантыку працы рабочага, механізатара, вучонага, а таксама навучыцца пераадольваць любыя цяжкасці «ради нескольких строчек в газете».

Выкладчыкі факультэта чыталі юнкорам лекцыі, знаёмілі іх з работай тэле- і радыёжурналістаў. На занятках кожны юнкор атрымліваў канкрэтнае заданне — напісаць матэрыял у вызначаным жанры або выказаць думкі па пэўнай праблеме. Выкананне задання было абавязковым. Такім чынам, вучні самі спасцігалі многія прафесіянальныя «азы». А калі разбіралі дамашнія заданні, усё часцей і часцей гучала: «Мы такое ўжо чыталі!» або «Штамп!». Алег Малюгін прызнаўся: «Я думаў, што журналісты і павінны пісаць толькі штампамі». Лепшыя матэрыялы Вольгі Баравік, Наташы Несцяровіч, Андрэя Дземянцьеўскага, Іры Коцешавай, Тані Вардомскай і Тані Дандуковай былі змешчаны на старонках «Чырвонкі». А выпускніцам Ані Тачыцкай і Марыне Куноўскай ШЮК дала характарыстыкі-рэкамендацыі для паступлення на факультэт журналістыкі. Цяпер дзяўчаты вучацца на першым курсе.

...Мінулы год запомніўся многім: экскурсіямі, цікавымі сустрэчамі. Але на першае месца ў ШЮК ставім усё ж не «тэорыю», а практыку. Галоўны прынцып работы школы юнкораў — добра піша той, хто ўмее думаць. Менавіта таму многія нашы заняткі праходзяць у форме дыскусій: «Ці ёсць рамантыка ў вучобе?», «Што перашкаджае жыць так, як хацелася б?», «Чаму мы спісваем?», «Дзень самакіравання — якім я бачу яго?», «Ці трэба імкнуцца быць выдатнікам?», «Фармальныя і нефармальныя лідэры — якія яны?», «Ці можа «двоечнік» быць цікавым чалавекам?». Мы гаварылі адкрыта пра тое, што хвалюе. «Забароненых» тэм у нас не было. Пасля агульнага абмеркавання таго ці іншага пытання наладжвалі «творчую хвілінку» — юнкоры абгрунтоўвалі сваю «пазіцыю» на паперы.

Неяк падышла да мяне васьмікласніца Таня Д.: «Я прапусціла пяць заняткаў — замалёўку цэлы тыдзень пісала, і начамі — таксама. Аднесла ў рэдакцыю, але яе не прынялі. Плакала доўга, вырашыла парваць з журналістыкай. Але не магу, мне хочацца пісаць!»

Без перабольшання скажу: кожны ў школе юнкораў — асоба, і з новай нашай сустрэчай раскрываліся новыя, незнаёмыя дагэтуль рысы характару кожнага. Напрыклад, Сяргей Беркутаў звычайна не прымаў актыўнага ўдзелу ў спрэчках і дыскусіях, толькі ўважліва слухаў. Яго лічылі ўсе ледзь не самым ціхім і негаваркім. Але аднойчы, калі загаварылі пра захапленні, высветлілася, што ён цікавіцца праблемамі НЛА, сабраў багатае «дасье» па гэтай тэме. Колькі цікавага расказаў ён!

Ёсць у ШЮК дзяўчынка з «цяжкай» сям'і (дома скандалы, бацька п'е), яна раней лічылася «цяжкай», а нядаўна сказала мне: «Я цяпер стала зусім іншай. У мяне з'явілася мара!..»

К канцу навучальнага года рады юнкораў паменшыліся амаль утрая. Многія, сутыкнуўшыся з цяжкасцямі, убачыўшы «прозу» журналісцкага хлеба, як самі потым гаварылі, «расчараваліся» ў прафесіі. Засталіся людзі, якія палюбілі журналістыку менавіта за нялёгкія яе будні. І няважна, што не ўсе яны стануць потым журналістамі. Галоўнае — на ўсё жыццё захаваюць вось такія ўсхваляваныя адносіны да газетнага слова, заўсёды будуць мысліць самастойна — што так неабходна чалавеку любой прафесіі.

Усіх, хто любіць думаць, спрачацца, тварыць, хто бачыць рамантыку ў «прозе жыцця» і не баіцца цяжкасцей, запрашаем у школу юнага карэспандэнта.

Прыходзьце, чакаем вас!

Т. ПАДАЛЯК,
студэнтка V курса факультэта журналістыкі.

## ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА. ШТО ЗРОБЛЕНА?

### «ТРАФАРЭТНАЯ АСОБА»

АРТЫКУЛ «Трафарэтная асоба», апублікаваны ў газеце «Беларускі універсітэт» 24 кастрычніка 1985 года, быў абмеркаваны на камсамольскіх сходах у групах, на пасяджэнні камітэта камсамола факультэта (пратакол № 14 ад 5 лістапада 1985 г.). Аб ім упаміналася і на справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі філалагічнага факультэта (14 лістапада 1985 г.). Факты, якія прыведзены ў артыкуле, пацвердзіліся поўнасцю. Пры абмеркаванні асабістых комплексных планаў на 1985—1986 навучальны год звярталася сур'ёзная ўвага на недапушчальнасць фармальнага падыходу да састаўлення планаў, на дрэнны кантроль за выкананнем пастаноў камсамольскіх сходаў.

І. КРЭТОВІЧ,
сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта.

## ПРАЕКТЫ ЦК КПСС: СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА ПАСКАРЭННЯ

# Аб прафесійнай кампетэнтнасці выпускнікоў

### ПРАПАНУЮ ДАПОЎНІЦЬ

ВЫПУСКНІКІ ВЫШЭЙШАЙ школы — гэта будучыя арганізатары і кіраўнікі вытворчасці, якія павінны мець пачуццё новага і ініцыятыўнасць, арганічна спалучаць прафесійную кампетэнтнасць з глыбокай унутранай ідэйнай перакананасцю, быць прынцыповымі і патрабавальнымі, добра выкарыстоўваць чалавечы фактар, асабіста ўдзельнічаць у выхаванні працоўных.

ВНУ краіны ў цяперашні час задавальняюць патрабаванні народнай гаспадаркі ў спецыялістах па асноўных спецыяльнасцях. Разам з тым узнікае праблема спецыялістаў па асабліва папулярных прафесіях, такіх, як інфарматыка і праграміраванне, медыцына, эканоміка і інш. Гэта патрабуе больш дакладнага планавання падрыхтоўкі кадраў на дзённых аддзяленнях і лепшага выкарыстання завочнага і вячэрняга навучання.

Спецыфіка вячэрняга і завочнага навучання заключаецца ў тым, што пачынаючы з першага курса студэнты-вячэрнікі і завочнікі ўжо знаходзяцца на вастрыні праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця, прымаюць непасрэдны ўдзел у іх рашэнні. Аднак у бліжэйшай перспектыве неабходна рэзка павысіць узровень кампетэнтнасці студэнтаў, якія навучаюцца ў ВНУ без адрыву ад вытворчасці.

Іменна высокая кампетэнтнасць спецыялістаў, максімальнае выкарыстанне чалавечага фактару дазволіць забяспечыць хуткі перавод эканомікі краіны на інтэнсіўны шлях развіцця. У сувязі з гэтым у праекце новай рэдакцыі Праграмы КПСС прапаную ў частцы другой, раздзеле пятым, параграфе другім перадапошні абзац дапоўніць так: **«...разам з завочным і вячэрнім навучаннем сістэма павышэння кваліфікацыі будзе ствараць усім працоўным спрыяльныя магчымасці для працягу адукацыі, бесперапыннага пашырэння і абнаўлення ведаў, пастаяннага росту іх агульнай культуры і прафесійнай кампетэнтнасці».**

Л. ДАВЫДЗЕНКА,
прарэктар універсітэта,
дацэнт.

### ВУЧОБА — ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА



*ЗАВЯРШАЕЦЦА першы семестр навучальнага года. Хутка надыйдзе той час, калі ў бібліятэках стане жарка ад перапоўненасці чытачамі, калі дзяўчына ці юнак з падручнікам ці канспектам у метро ці на прыпынку аўтобуса стане звычайнай з'явай. Набліжаецца сесія. Сёння яшчэ ёсць час. І таму студэнт уважліва слухае выкладчыка, старанна запісвае за ім, папаўняючы сваю скарбніцу ведаў.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*

**Ва універсітэце створаны цэнтр па вывучэнню грамадскай думкі, які за два гады свайго існавання правёў вялікую работу па каардынацыі і арганізацыі даследаванняў, аналізу эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчай і грамадска-палітычнай работы сярод студэнцкай моладзі. Пад кіраўніцтвам савета цэнтра абагульнены вынікі чатырохгадовага даследавання па тэме «Маральна-псіхалагічны клімат студэнцкага калектыву і шляхі яго ўдасканалення», праведзена навукова-практычная канферэнцыя, на якой былі прыняты рэкамендацыі па ўдасканаленню арганізацыйнай і выхаваўчай работы ў студэнцкіх калектывах універсітэта.**

### ВЫВУЧАЕМ ГРАМАДСКУЮ ДУМКУ

# АДЧУВАЦЬ ПУЛЬС

ПРАЦЯГВАЕЦЦА даследаванне па тэме «Адаптацыя студэнтаў у ВНУ і шляхі ўдасканалення кіравання гэтым працэсам». Па яго выніках былі зроблены паведамленні на пасяджэннях саветаў некаторых факультэтаў (геаграфічнага, біялагічнага), на семінарах куратараў студэнцкіх груп, у школе камсамольскага актыву універсітэта.

Па заданню рэктарата сіламі грамадскай студэнцкай лабараторыі сацыялагічных даследаванняў вывучалася грамадская думка студэнтаў па пытаннях, якія пастаўлены перад вышэйшымі навучальнымі ўстановамі адносна павышэння эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу. Аб асноўных абагульненых выніках было паведамлена на пасяджэнні рэктарата. Зараз ажыццяўляецца комплекснае вывучэнне грамадска-палітычнай работы ў студэнцкіх калектывах, сюды патрэбна ўключыць і ацэнку эфектыўнасці студэнцкага самакіравання, узроўню палітычнай культуры студэнцкай моладзі.

Вынікі даследаванняў дазваляюць ужо зараз рабіць некаторыя вывады і ўносіць рэкамендацыі па павышэнню эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу, па ўдасканаленню сістэмы камуністычнага выхавання студэнтаў. Гэта датычыцца ў першую чаргу такіх пытанняў, як удасканаленне методыкі семінарскіх заняткаў, функцыяніравання інстытута куратараў, парадку падбору і вылучэння студэнтаў у органы студэнцкага самакіравання (у тым ліку, напрыклад, пытанне аб выбарнасці старастаў студэнцкіх груп), павышэнне эфектыўнасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў да выхаваўчай работы і г. д.

Назапашаны вопыт дазваляе ўдасканальваць работу па вывучэнню грамадскай думкі па актуальных пытаннях жыццядзейнасці студэнцкіх калектываў, у тым ліку шляхам правядзення аператыўных, сацыялагічных, сацыяльна-псіхалагічных і этыка-сацыялагічных даследаванняў. Аднак для гэтага неабходна ажыццявіць некаторыя кардынальныя меры.

У першую чаргу патрэбна ў састаў савета цэнтра ўвесці не толькі спецыялістаў-сацыёлагаў, але і прадстаўнікоў усіх органаў кіравання і самакіравання, якія зацікаўлены ў атрыманні інфармацыі аб зваротнай сувязі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе (ад вучэбна-метадычнага савета, ад савета куратараў, ад прафсаюзных камітэтаў і г. д.).

Неабходна забяспечыць галоснасць вынікаў вывучэння грамадскай думкі, выкарыстоўваючы пры гэтым не толькі нарады, семінары, але і шматтыражную газету «Беларускі універсітэт», другія сродкі масавай інфармацыі.

Патрэбна дабівацца прыняцця канкрэтных рашэнняў па аргументаваных вывадах і рэкамендацыях, якія выпрацоўваюцца цэнтрам вывучэння грамадскай думкі. Больш таго, забяспечваць галоснасць рашэнняў, якія прымаюцца такім чынам.

Рэалізацыя гэтых мер будзе садзейнічаць таму, каб створаны пры парткоме цэнтр вывучэння грамадскай думкі стаў адным з асноўных звенняў сістэмы навуковага кіравання ў калектыве нашага універсітэта.

І. ПІСАРЭНКА,
намеснік старшыні савета
цэнтра па вывучэнню
грамадскай думкі
універсітэта.

### АГЛЯД НАСЦЕННАГА ДРУКУ

# ЯК ДАПАМАГЧЫ ГАЗЕЦЕ?

ЯК ВЯДОМА, газеты бываюць розныя: вялікія і зусім малыя, афармленыя з густам і не зусім, цікавыя і сумныя.

А яшчэ ёсць газеты насценныя. Іменна яны і ўвасабляюць у сабе ўсе вышэйназваныя азначэнні. Багацце супрацьлеглых параўнанняў не выпадковае.

Як паказвае вопыт, найбольшая цікавасць да насценнага друку некаторых партыйных бюро, камітэтаў камсамола і нават саміх рэдкалегій газет факультэтаў прыходзіць толькі тады, калі падводзяцца вынікі чарговага агляду-конкурсу. І калі тая або іншая газета займае месца не ў ліку першых. «Чаму так?» — пытаюцца шматлікія хадакі ў членаў камісіі. Пытанне справядлівае. Сапраўды, чаму так?

**Выбар рэдкалегіі газеты.** У газеце «Vita» біялагічнага факультэта гэта пытанне вырашана. Тут рэдкалегію не прызначаюць, а ўсе яе члены самі клапоцяцца: хто прыйдзе ім на змену. Далучэнне да выпуску газеты шырокага аўтарскага актыву, вывучэнне магчымасцей першакурснікаў дазваляе ўключаць у журналісцкую дзейнасць людзей сапраўды творчых, якія працаваць будуць не пад прымусам, а з цікавасцю і задавальненнем.

Не будзем меркаваць, як будзе працаваць новы рэдактар насценнай газеты геаграфічнага факультэта. Але тое, што прызначаны на гэту пасаду незнаёмай яму дзяўчынай першакурснік пакуль яшчэ ў разгубленасці,— без увагі не пакінем. У школе ён быў рэдактарам газеты. Відаць, гэты добра вывучаны радок характарыстыкі і стаў падставай назначэння навічка рэдактарам друкаванага органа партбюро, прафбюро і камітэта камсамола геафака.

Якой павінна быць насценгазета? Пра гэта новы рэдактар газеты «Рошым любую задачу» мехмата мае таксама самае агульнае ўяўленне.

**І ўсё ж газета выходзіць у свет.** У паўзмроку калідора бялеў невялікім лістком першы нумар «Гісторыка». У прысвечанай новаму навучальнаму году насценцы на відным месцы вельмі ўзнёслы матэрыял: «Шмат новага прынёс з сабою і першы тыдзень вучобы. Быццам тая дарога, па якой я крочыла 10 гадоў, зрабіла круты паварот. Якія неабсяжныя гарызонты ведаў адкрыліся раптам, як многа цікавага і няведанага наперадзе!» Прыўзняты настрой і радасць невядомай першакурсніцы можна зразумець. Але наступны матэрыял А. Пухава «Атрады факультэта — дзейнічаюць, працуюць, рапартуюць» сведчыць пра тое, што гэтыя пачуцці... канчаткова знікаюць ужо на III курсе. Вось як апісвае аўтар падзеі прайшоўшага лета. «Будатрады гістфака сёння — рэальная сіла ў ажыццяўленні планаў... Студэнцкія атрады валодаюць вялікімі магчымасцямі выхаваўчага ўздзеяння на асобу будучага спецыяліста»... І знікае пасля такіх радкоў радасны настрой, губляюць фарбы ўспаміны пра будатрадаўскае лета. Аўтар матэрыялу настолькі захапіўся трафарэтным апісаннем, што і не заўважыў, як публікацыя, гаворачы мовай А. Пухава, страціла рэальную сілу ўздзеяння на чытача.

**Навошта насценным газетам такія матэрыялы?** Хаця многія рэдактары могуць і запярэчыць: добра, што ёсць і такія. І сапраўды, «творчыя камандзіроўкі» многіх членаў рэдкалегій зводзяцца да блукання ад аднаго выкладчыка да другога, вымольвання ў студэнтаў матэрыялаў... Чаму пісаць для насценкі яны лічаць для сябе нечым заганным? Няўжо нішто не хвалюе, няма пра што расказаць студэнтам, падзяліцца вопытам выкладчыкам? Ад такой агульнай зацікаўленасці і залежыць не простае запаўненне газетнай плошчы, а сапраўдная змястоўнасць газеты.

**Пытанне напрошваецца само сабой.** Як дапамагчы факультэцкай насценцы? І адказ на яго дае ўсё тая ж практыка. Праводзіцца вучоба для рэдактараў насценных газет. Праўда, па розных прычынах ведае пра яе існаванне даволі абмежаванае кола зацікаўленых асоб, а наведвае і таго менш.

Семінар рэдактараў насценных газет факультэтаў і прадугледжвае навучыць іх асновам журналісцкай дзейнасці. Дапамагчы правільна выбіраць тэму для будучай публікацыі, размяшчаць матэрыял на паласе. І тады, вядома, у адной газеце ўсе жанры журналістыкі не будуць называцца адным — інтэрв'ю, а ў другой — артыкулам і ніколі не пераблытаюцца назвы рубрык з назвамі загалоўкаў.

Творчыя сустрэчы і абмен вопытам з рэдкалегіямі лепшых ва універсітэце газет — «Журналіста» факультэта журналістыкі і «Vita» біялагічнага факультэта,— якія праходзілі на занятках, вядома, былі цікавымі і карыснымі для ўсіх рэдактараў.

Газета пачынаецца з рэдакцыі, з тых людзей, якія могуць і хочуць працаваць творча, якім пад сілу зрабіць яе цікавай і змястоўнай. І ўсё ж аднаго энтузіязму членаў рэдкалегіі тут мала. Толькі агульнымі намаганнямі партбюро і камітэта камсамола, рэдкалегіі газеты і шырокага аўтарскага актыву можна зрабіць газету цікавай і неабходнай чытачам.

А. МАТУСЕВІЧ,
член камітэта камсамола
універсітэта.

## ...І ПЯЦЬ СТУДЭНЦКІХ ГАДОЎ



*ШУМНА было ў камітэце камсамола геаграфічнага факультэта. Рыхтаваўся вечар першакурснікаў — «Пасвячэнне ў студэнты». І як заўсёды, кожны курс жадаў перадаць сваім малодшым сябрам тыя веды студэнцкага жыцця, якія ўжо набыў кожны з іх.*

*Марына Бельчыкава, студэнтка ІІ курса 4 групы, адказная за культурна-масавы сектар, Святлана Урбанская, IV курс, 3 група, староста, Элеанора Латышава, ІІ курс, ІІ група, старшыня КВК прафкома былі так захоплены падрыхтоўкай вечара, што і не заўважылі, як іх сфатаграфавалі.*

*Фота і тэкст А. ВАЛОШЫНА.*

# ПА НЯБАЧНАМУ СЛЕДУ

## НАШЫ ВЫПУСКНІКІ

СУСТРЭЦЦА ніяк не выпадала. Уладзімір Казіміравіч Саевіч аказаўся вельмі занятым чалавекам. Аднак нягледзячы на завочнае знаёмства, я нямала ведаў пра яго. Ведаў, што ён скончыў хімічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна, што спецыяліст першага класа, мае ўзнагароды. Ведаў і тое, што яго былыя вучні зараз паспяхова працуюць у Сімферопалі, Ташкенце, Алма-Аце, Уладзіміры, Калузе... І, чакаючы размовы, спадзяваўся, што раскажа аб усім гэтым больш падрабязна. Але старшы эксперт экспертна-крыміналістычнага ўпраўлення МУС БССР Саевіч толькі крыху ўспомніў аб сваім амаль трыццацігадовым шляху, засяродзіўся на сённяшніх задачах і праблемах. І з асаблівай цеплынёй загаварыў пра свайго цяперашняга вучня, а дакладней, малодшага калегу Аляксандра Леўшанкова.

...А палове трэцяй у маёй кватэры зазваніў тэлефон, і мне прапанавалі выехаць на выклік. Літаральна праз якіх-небудзь дзесяць мінут міліцэйскі «газік» імкліва імчаўся па бязлюднаму начному Мінску. Мне з цяжкасцю знайшлося месца ў машыне. Аператыўная група была ў поўным саставе — эксперт, следчы, супрацоўнік крымінальнага вышуку, праваднік службова-вышукальнага сабакі са сваім чацвераногім сябрам. Усе хутка на хаду пазнаёміліся. Вось ён які, вучань Саевіча, падумаў я, калі прадставіўся эксперт Аляксандр Леўшанкоў у форме капітана міліцыі. Падцягнуты, засяроджаны, з нейкай шчырай дзіцячай усмешкай. За акном мільгалі вуліцы — Рэспубліканская, Апанскага. Выехалі на праспект Пушкіна — і хутка апынуліся на Ракаўскай шашы. Супрацоўнік крымінальнага вышуку растлумачыў мне, у чым прычына гэтага начнога выкліку. Непадалёк ад Мінска адбыўся крадзеж у сельмагу. Злачынец узламаў дзверы магазіна. Украў пліткі шакаладу, кансервы ў бляшанках, віно. Злодзею ўдалося знікнуць...

Мінут праз 25—30 аператыўная група была ўжо на месцы здарэння. Яе сустракалі загадчыца магазіна, участковы інспектар. Кожны з супрацоўнікаў міліцыі, дакладна ведаючы сваю задачу, прыступіў да работы. Аляксандр Леўшанкоў агледзеў невялікую гандлёвую залу, узламаныя дзверы. Бліснула фотаўспышка, у руках эксперта — незнаёмыя прыборы. І раптам на паліцы побач з таварамі ён звярнуў увагу на пакет фарбы. Яго, як высветлілася, забыла прадаўшчыца. Ён быў разарваны, на падлозе эксперт заўважыў сляды гэтай жа чырвонай фарбы. Гэты «узор» Аляксандр узяў у спецыяльную прабірку. «Павязу ў лабараторыю на даследаванне, параюся з Саевічам»,— растлумачыў ён... Адначасова ішоў пошук злачынца. Органам міліцыі была дадзена арыенціроўка на чалавека, які мае на целе ці адзенні сляды чырвонай фарбы.

...На наступны дзень у адным з магазінаў Мінска работнікамі міліцыі быў затрыманы малады хлопец. Падазраваемага даставілі ў хімічную лабараторыю экспертна-крыміналістычнага ўпраўлення МУС рэспублікі да Уладзіміра Казіміравіча Саевіча.

Праведзены падбор патрэбных растваральнікаў. Пры іх дапамозе У. К. Саевіч амаль імгненна зняў з рук хлопца рэшткі чырвонай фарбы. Затым ён правёў параўнальнае даследаванне фарбы, дастаўленай Аляксандрам Леўшанковым з месца здарэння і знятай толькі што з рук падазраваемага. Узоры аказаліся зусім аднолькавымі. Пасля прад'яўлення заключэння эксперта злачынец тут жа ў лабараторыі прызнаўся ва учыненым ім крадзяжы. Расследаванне начнога выкліку было закончана за адны суткі...

Праз некалькі дзён мне зноў давялося сустрэцца з крыміналістамі Аляксандрам Леўшанковым і Уладзімірам Казіміравічам Саевічам, пазнаёміцца з іх службовымі буднямі, захапляцца іх высокім прафесіяналізмам. Вакол мноства самай сучаснай апаратуры. І велізарная колькасць прабірак, колб... Праводзіцца чарговае крыміналістычнае даследаванне. Як і заўсёды, неабходна дакладная аналітычная інфармацыя для выкрыцця злачынства. Сёння яе чакаюць супрацоўнікі Магілёўскай міліцыі. Сігнал аб кватэрным крадзяжы. Украдзены каштоўныя залатыя рэчы — пярсцёнкі, бранзалет, завушніцы. Згодна з версіяй следчага, злачынец пераносіў украдзеныя вырабы з золата ў сваёй нейлонавай спартыўнай куртцы. І вось яна тут — у лабараторыі. Пабочнаму чалавеку гэта здаецца зусім непатрэбным. Кішэні ж курткі пустыя, а ўкрадзенае, відаць, прададзена. Як даказаць віну? Між тым эксперт Аляксандр Леўшанкоў уважліва вывучае кожную з кішэней, праводзіць адпаведную хімічную апрацоўку. І праз некаторы час ён знаходзіць у правай нагруднай кішэні курткі зусім нязначныя сляды золата. Уласна гэта крыміналістычнае заключэнне эксперта, як я даведаўся пазней, з'явілася асноўным доказам выкрыцця злачынца. Версія следчага стала аксіёмай.

...Закончаны рабочы дзень крыміналістаў, адзін з многіх рабочых будняў, але і ў гадзіны адпачынку ў Аляксандра Леўшанкова і Уладзіміра Казіміравіча Саевіча многа агульных захапленняў. Абодва — выдатныя фатографы, добра разбіраюцца ў радыётэхніцы. І, думаецца, што гэта заканамерна.

М. ЛІБІНТАЎ.

# «ІНФАНТЫЛЫ»... З ДЫПЛОМАМ?

## ПАЛЕМІЧНЫЯ НАТАТКІ

**Апошнім часам гэты эпітэт усё часцей стаў далучацца да словаспалучэння «маладое пакаленне». Не толькі ў размовах, што вядуцца ў лагеры «бацькоў», але і на старонках маладзёжных выданняў. Зазірнём у тлумачальны слоўнік беларускай мовы: «Інфантылізм — адсталасць у развіцці арганізма, якая праяўляецца ў захаванні ў дарослым стане фізічнай будовы і псіхічных рыс, ул...цывых дзіцячаму ўзросту. Бестурботнасць, лёгкадумнасць, якія спалучаюцца з крайнім эгаізмам».**

НА КАМСАМОЛЬСКІМ справаздачна-выбарным сходзе апошнім узяў слова выкладчык, даволі вядомы не толькі на сваім родным факультэце. З абурэннем параўноўваў ён энтузіязм камсамольцаў з працэсам гарэння мокрага. Успомніўшы сваё баявое юнацтва, пытаўся, чаму моладзь стала інфантыльнай? І на самай справе, чаму?

Адказ прыйшоў нечакана, сам сабой. На тым жа факультэце рыхтавалася чарговае мерапрыемства, у адпаведнасці з планам работы. Ці то выпадковаю воляй лёсу, ці то знарок, але адказным за яго правядзенне з'явіўся знаёмы нам ужо выкладчык, які літаральна забыў спакой і сон, прысутнічаў на ўсіх рэпетыцыях і выступаў у ролі галоўнага рэжысёра. Словы яго былі безапеляцыйнымі і абмеркаванню не належалі. Студэнтам заставалася толькі выконваць загады...

Выпадак не ўнікальны. Ці не так? Тым больш, што прыклад на самай справе ўзяты з жыцця. Студэнты розных факультэтаў могуць заявіць: «Дык гэта ж у нас было!»

Аднак, думаецца, не ў канкрэтным адрасе справа, а ў самой з'яве, якая і нараджае інфантыльнасць у студэнтаў, пазбаўляе іх патрэбы і неабходнасці думаць. І такое адбываецца не толькі ў грамадскім жыцці. Няхай кожны прыгадае, як студэнцкай аўдыторыі нярэдка чытаюцца лекцыі.

Устаў выкладчык за трыбуну і — метадычна, пункт за пунктам, голасам, які не дапускае пярэчанняў, як нешта само сабой вядомае, даводзіць матэрыял да слухачоў. Думаць апошнія не паспяваюць, паспець бы запісаць, канспект аформіць. Ён — абавязковы атрыбут на экзамене, своеасаблівы пропуск на яго. Ды і чытаецца ў большасці тое, што напісана ў падручніках па гэтаму ж прадмету.

Раней вясковы ўклад жыцця прадугледжваў падзел працы на «мужчынскую» і «жаноцкую». Адпаведна і дзеці ў такіх сем'ях з маленства прывыкалі да сваіх пэўных абавязкаў, да ранняй адказнасці за «уласны фронт работ».

З перамяшчэннем цэнтра актыўнасці ў горад змянілася і перастаноўка сіл. А ўмовы жыцця амаль сцерлі розніцу між хатнімі клопатамі «моцнай» і «слабай» полаў, паменшылі аб'ём гэтых клопатаў. Знайсці сям'ю, у якой дзеці з маленства прывучаюцца да працы па дому, маюць нейкія абавязкі, безумоўна, замацаваныя за імі, — не проста. Ці так ужо рэдка прыходзіцца чуць: «Мы намучыліся, пакуль на ногі ўсталі — няхай хоць дзеці пажывуць як след». У такіх бацькоў дзеці, як лялькі, выпешчаныя ў раскошы і бестурботнасці, апрануты ва ўсё самае дарагое і самае моднае, аб чым тата і матуля ў свой час не маглі нават і марыць.

Ітак, зерне інфантыльнасці дае першыя ўсходы, яны старанна культывуюцца і дагледаюцца ў школе, дзе ўсякія вытокі ініцыятывы натыкаюцца на апякунства настаўнікаў, бацькоўскага камітэта, шэфаў...

Нават у малодшых класах энергічным і рухавым хлопчыкам, ад якіх нямала нязручнасцей, ставяцца ў прыклад млявыя і меланхалічныя таварышы, якія, аднак, не заўсёды могуць служыць узорам у вучобе і грамадскай працы.

Як эстафетную палачку, перадаюць юначую асобу бацькі са сваіх рук у рукі настаўнікаў, а тыя — адно аднаму, аж да выпускнога балю.

Мары прыходзяць і адыходзяць, а жаданні бацькоў застаюцца. Яны суразмерныя магчымасцям «прыладзіць» любімае дзіця ў ВНУ: «А што мы — горш за іншых?» Так малады чалавек ці дзяўчына воляю лёсу і сваіх бацькоў трапляе за студэнцкую парту факультэта, дзе ён ніколі не марыў вучыцца, нават не цікавіўся, чаму тут вучаць.

Аднак з першага ж дня — ніякіх праблем у новаспечаных студэнтаў. Яны — прадмет асаблівых турбот дэканата, прафесараў і дацэнтаў. Каб у інтэрнаце парадак быў, сівы доктар навук з другога канца горада ў непагадзь едзе і на адзін вечар становіцца нянькаю дваццацігадовым маладым людзям. Апошнім так прасцей, спакайней і турбот ніякіх.

Пераважная колькасць маладых людзей паступае ва універсітэт пасля службы ў радах Савецкай Арміі, дзе ў 18—19 гадоў ім давяралі складаную баявую тэхніку, прызначалі камандаваць разлікамі, экіпажамі, аддзяленнямі. Прайшоўшы школу армейскай загартоўкі, дзе няма папраўкі на ўзрост, былы салдат ці сяржант трапляе ў вышэйшую школу. І тут, дзіўная справа, намаганнямі выкладчыкаў і дэканата яму даюць адчуць, што ён — хаця і дарослае, але яшчэ дзіця. Самае горшае, большасць выдатнікаў баявой і палітычнай падрыхтоўкі ахвотна мірацца з такім становішчам і роляй. На час, а то і назаўсёды забываюць урокі армейскай службы.

І яшчэ адна ўмова, якая з поспехам плодзіць інфантыльнасць. Гэта — фармалізм. Давайце разам падлічым, колькі ў нас яшчэ мерапрыемстваў праводзіцца дзеля ўсё той жа славутай «галачкі»! Ды што там казаць, хіба не бывае, што патрэбныя важныя мерапрыемствы праводзяцца фармальна? Адсюль і абыякавасць да іх, і інертнасць.

Аднак прырода, як кажуць, бярэ сваё. У 20 гадоў хочацца быць незалежным і самастойным. І на сённяшні дзень, бадай, адзіная магчымасць студэнтам пабыць прадастаўленымі самім сабе — суботнія дыскатэкі ў інтэрнатах. На самым апошнім паверсе (каб камендант не пачуў), пасля апоўначы (каб адказны выкладчык, нарэшце, ужо пайшоў дадому).

Можна было б яшчэ доўга разважаць аб шкоднасці інфантыльнасці. Аднак гэта толькі следства, якое знікне, калі знікне і сама прычына — залішняе апякунства.

На вытворчасці, у навуковых і вучэбных установах сёння чакаюць дзелавых, самастойных, здольных на творчы пошук выпускнікоў, якім будуць даручаны адказныя ўчасткі работы. Аднак ці заўсёды студэнты набываюць такія навыкі і рысы ў сценах «альма-матэр»? І не сакрэт, здараецца, у выглядзе дыплома аб вышэйшай адукацыі пуцёўку ў самастойнае жыццё атрымоўвае самы сапраўдны інфантыл, дацягнуты да фінішнай рысы нечалавечымі намаганнямі выкладчыкаў і дэканата. Дзеля чаго?

В. МЫШАНЕЦ.

# Ідзі і глядзі

ДАЎНО СКОНЧЫЛАСЯ вайна, адышла ў мінулае, стала гераічнай гісторыяй барацьбы супраць фашызму, за свабоду і шчасце, за жыццё. Толькі памяць, трывожная памяць не дае спакою людзям, якія перажылі вогненнае ліхалецце. Пра тое, што балюча ўспамінаць, але забыць немагчыма, расказвае фільм «Ідзі і глядзі», пастаўлены на кінастудыі «Беларусьфільм» рэжысёрам Э. Клімавым. У яго аснову пакладзены кнігі вядомага беларускага пісьменніка Алеся Адамовіча «Я з вогненнай вёскі...» і «Карнікі», успаміны сведкаў, некаторыя факты з біяграфіі аўтара.

«Ідзі і глядзі»,— звяртаюцца да гледача стваральнікі фільма. За простым сялянскім хлапчуком Флёрай ідзі па знявечанай, ахопленай полымем беларускай зямлі і глядзі, што ўчынілі на ёй нелюдзі з чалавечым абліччам. Глядзі і думай, як магло такое здарыцца, адкуль узялася гэтая жорсткасць, звярыная прага да крыві, да ўлады над слабымі і безабароннымі.

Змяняюцца жудасныя кадры: целы забітых, замучаных людзей, пранізлівы жаночы плач, які рвецца з палаючага драўлянага хлява — і крывавыя оргіі п'янай ад неабмежаванай улады арды ў шэрых мундзірах. Усяго некалькі дзён лета 1943 года паказана ў фільме. Але тое, што давялося перажыць за гэты час звычайнаму падлетку, усмешліваму і непаседліваму, ператварыла яго ў старога, сівога чалавека са спыненым позіркам... Ён выжыў, вытрымаў гэтае нечалавечае выпрабаванне і застаўся чалавекам. Ён — сведка злачынстваў, жывая памяць і боль.

Цяжка перадаць словамі пачуцці залы: напружанасць, жах, узрушанасць, немагчымасць стрымаць слёзы. Сцэнарыста фільма Аляксандра Міхайлавіча Адамовіча гледачы — студэнты універсітэта сустрэлі стоячы. Доўга не змаўкалі апладысменты. «Ваш фільм прымусіў мяне па-новаму зірнуць на вайну, зразумець сэнс таго, што адбылося сорак гадоў назад»,— было напісана ў адной са шматлікіх запісак, адрасаваных аўтару. Адказваючы на вялікую колькасць пытанняў, А. Адамовіч сказаў:

**— Мы імкнуліся расказаць пра ваенныя падзеі так, як гэта не рабіў да нас ніхто. Наш фільм — памяць народа пра тых, хто загінуў у полымі мінулай вайны, перасцярога тым, хто рыхтуе новы сусветны пажар. Беларуская стужка дэманстравалася ў многіх краінах. Яе гледачамі былі людзі розных узростаў, палітычных поглядаў. Узнікалі процілеглыя думкі і меркаванні. Вось, напрыклад, як адрэагавалі газеты Фінляндыі: «Пасля такога фільма ваяваць не захочацца». І мне здаецца, што так лічаць большасць заходніх гледачоў. Новая вайна стане апошняй у гісторыі чалавецтва. Наш фільм — уклад у барацьбу за мір ва ўсім свеце.**

**А. ЯКУБЕЦ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**



**АЎТОГРАФ А. АДАМОВІЧА:**
**«Студэнтам, чытачам, газеце «Беларускі універсітэт» — і для мяне усё Ваша блізка і памятна па 1945—50 г.г.»**

# Святлана Алексіевіч: «У ІМЯ ЖАНОЧАЙ ВЕРЫ»

**На сустрэчу са студэнтамі і выкладчыкамі факультэта журналістыкі прыйшла Святлана Алексіевіч. Кожны, хто чытаў яе першую кнігу «У вайны — не жаночы твар...»,— цікавіўся, якая яна — гэтая жанчына, што ўзняла на свае плечы боль і горыч дзяўчат ліхалецця. Так, праз шмат гадоў пралягла лінія подзвігу — ад ваеннага пакалення, што змагалася супраць фашызму, да асобы С. Алексіевіч, якая адкрыла свету нязведаную старонку Вялікай Айчыннай вайны.**

**Як сваім малодшым калегам, С. Алексіевіч шчыра расказала аб нялёгкай працы над першай і другой кнігай («Апошнія сведкі», якая, дарэчы, выйшла ў выдавецтве «Маладая гвардыя»), адказала на пытанні прысутных. Сёння мы прапануем інтэрв'ю з пісьменніцай і журналісткай.**

**Сустрэча з Алесем Адамовічам прайшла ў актавай зале універсітэта. Водгук аб яго кінастужцы «Ідзі і глядзі» таксама прапануецца вашай увазе.**

**С. АЛЕКСІЕВІЧ:** Чатыры гады я ішла апаленымі кіламетрамі чужога болю і чужой памяці... Не раз мне было страшна. Не раз было балюча... Столькі разоў я хацела забыць тое, што чула. Хацела і ўжо не магла. Мая памяць — гэта ўжо іх памяць. Іх памяць — мая памяць.

**«У вайны — не жаночы твар» — кніга, якая складзена з расказаў жанчын-франтавічак, тых, хто вынес жудасную вайну на сваіх плячах. Звыш 500 чалавек выслухала Святлана Алексіевіч.**

**Як жа пачалася работа над кнігай? Святлана — нядаўняя выпускніца журфака, гутарыла з Алесем Адамовічам, і ён прапанаваў маладой журналістцы пайсці з магнітафонам «у людзі».**

**С. АЛЕКСІЕВІЧ:** Мяне цікавіла нават і не вайна як з'ява, а духоўны стан чалавека. Не апісанне ваенных аперацый, а дакладнае чалавечае жыццё на вайне хвалюе і кранае сёння больш за ўсё. Вайна павысіла значнасць кожнага факта жыцця, кожнай дробязі...

**— Святлана Аляксандраўна, чаму Вы ўзяліся за такую кнігу?**

— «Жанчына на вайне... Гэта штосьці такое, пра што яшчэ няма чалавечых слоў»,— скажа адна з гераінь кнігі. Мы ў вечным даўгу перад гэтымі жанчынамі. І недаравальна, што пра іх так мала напісана. Чаму за такую работу не ўзяўся хтосьці з мужчын-літаратараў? Таму што толькі чыста жаночы погляд на тое, што было ў час вайны, мог даць адкрыццё. Жанчына-літаратар павінна была ўнесці свой свет.

Калі я пачынала работу над кнігай, ставіла перад сабой тры задачы: па-першае, каб кожны здзівіўся, што такое — жанчына. Па-другое, каб кожны зразумеў, што такое — ваеннае пакаленне. І па-трэцяе, каб нікога не пакідала пачуццё віны перад гэтымі жанчынамі. Іх, жанчын, каго сама прырода прызначыла працягваць жыццё, іх вайна прымусіла забіваць...

**— Магчыма, гэтым парадоксам тлумачыцца яшчэ адзін: кніга аб жорсткасці, а нараджае чысціню пачуццяў, пакідае ў душы штосьці светлае, жыццясцвярджальнае...**

— Мне хацелася сваёй кнігай навучыць суперажыванню, спагадзе. Пісала аб вайне як аб жыцці і смерці наогул, спрабавала паставіцца да гэтай нечалавечай з'явы як да духоўнага і эмацыянальнага вопыту.

**— Але ж самі Вы вайну не бачылі...**

— Я належу да пакалення, якое бачыла толькі людзей, што былі на вайне. Я пішу аб гэтых людзях. Ва мне жыве генетычная памяць, і я імкнуся яе выявіць.

Сярод старэйшага пакалення існуе такая думка, што мы, маладыя, тыя, хто не бачыў вайну, не маем права пісаць пра яе. Але ж вайна так ці інакш закранула кожную сям'ю: дзядулі, дзядзькі, бабулі засталіся там, на вайне, а мы раслі без іх.

«Вайну хочацца забыць, цяжка жыць чалавеку з такой жорстка нагружанай памяццю, з такой закатаванай душой. Але што будзе з намі, калі яны не перададуць нам сваю памяць? А забыць сёння нельга. Надзвычай трывожна ў свеце»,— гэта радкі з кнігі. Цяжка было слухаць успаміны аб вайне, яшчэ цяжэй было ўспамінаць. Не адна з гэтых жанчын, гераінь кнігі, прызнавалася: «Не магу глядзець, як дзеці гуляюць у вайну», «Я ў лес да гэтага часу не магу хадзіць. Асабліва, дзе растуць старыя дубы ці бярозы... Не магу там сядзець...» І амаль кожная гаварыла: «Не хачу ўспамінаць...».





**— Па Вашай кнізе знят дакументальны фільм, Вы — лаўрэат Усесаюзнай літаратурнай прэміі імя Мікалая Астроўскага, узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», на выданне кнігі заключаны кантракты з замежнымі фірмамі, у тэатрах ідуць спектаклі па кнізе...**

— Прызнаюся, такога поспеху я не чакала, нават у думках не было. Хутчэй, наадварот. Я адчувала, што матэрыял мяне нібы душыць, не дае жыць так, як жыла раней. З кожным днём было ўсё цяжэй і цяжэй, але і пакінуць ужо не магла. І вось...

З маскоўскім тэатрам на Таганцы я тры месяцы працавала над спектаклем. Трэба сказаць, у розных тэатрах — розныя спектаклі. У Омскім, напрыклад,— больш адкрыты, публіцыстычны. У тэатры на Таганцы ён задуман як пераклічка пакаленняў, як размова. На сцэне адбываецца тое, што, на жаль, нельга здзейсніць у жыцці: жанчыны, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, сустракаюцца з тымі дзяўчынкамі, якімі былі яны ў гады вайны.

**— Зусім нядаўна выйшаў Ваш новы твор «Апошнія сведкі. Кніга недзіцячых расказаў». Як працавалася над ім?**

— У многіх кватэрах я запісвала адразу два расказы — маці і ўжо дарослай дачкі ці сына, а тады, у вайну, маленькага дзіцяці ці падлетка. І дзіцячая памяць часта з нечаканага боку высвятляла падзеі. Я ведала, што матэрыял выкарыстаю пазней. Але нельга сказаць, што абедзве кнігі складаліся адначасова: для другой я запісала яшчэ больш 200 расказаў. Сёння тыя дзеці — апошнія сведкі трагічных дзён. За імі няма і не павінна быць нікога!

Як зберагчы планету людзей, на якой дзяўчынкі павінны раніцай спаць у сваіх ложачках, а не ляжаць на дарозе забітымі з незаплеценымі коскамі?.. І каб дзяцінства ніколі больш не называлася вайной. У імя такой маёй жаночай веры гэта кніга!

**— Існуе шмат меркаванняў наконт жанру, у якім напісаны кнігі. Як бы Вы самі вызначылі яго?**

— Кнігі напісаны ў жанры такіх вядомых работ, як «Я з вогненнай вёскі» А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка і «Блакадная кніга» А. Адамовіча і Д. Граніна. Я сказала б, гэта новы від дакументальна-мастацкай прозы. Дарэчы, зварот да такой літаратуры прадбачыў яшчэ Леў Талстой.

**— Вы сказалі, дакументальна-мастацкай... Але ж ні ў адной з вашых кніг мы не сустрэнем ні нумароў часцей, ні дакладных дат, ні дакладных месц...**

— Я перачытала амаль усё, што было напісана пра вайну, і зразумела: мая кніга не павінна быць даведнікам падзей і лічбаў. Самы галоўны дакумент — тое, што чалавек адчуваў. А ў іх, гэтых жанчын, з'явілася пачуццё незваротнасці адыходу. Гэта завастрае пачуццё: чалавек не фальшывіць, яму не трэба іграць.

Я наогул была супраць стэрэатыпаў, нават у афармленні вокладкі: занадта звыклым здаецца калючы дрот і выбух.

**— Кніга «У вайны — не жаночы твар» як бы «змацавана» аўтарскімі разважаннямі, а ў «Апошніх сведках» іх няма...**

— Я працягвала пошук у новым жанры. Кніга «Апошнія сведкі» пабудавана па прынцыпу вітражу: з кавалачкаў — малюнак, палатно. Аўтар прысутнічае толькі ў падборы матэрыялу, у светапоглядзе. Атрымліваецца, як у архітэктуры: пабудова створана, але ніхто не павінен бачыць, чым і як яна змацавана. Ды і якія словы аўтара могуць быць роўнымі па сіле з тымі, што гаворыць ваеннае дзяцінства? Вось вам прыклад:

«Валя Вырко — 3 гады. Зараз — рабочая. Жыве ў Полацку: «...Дзядулю забілі, мы пахавалі яго у нас пад акном. На могілках не далі пахаваць, таму што ён забіў немца. Да канца вайны на тым месцы вырас падарожнік. З таго часу я ніколі не рву падарожнік».

**— Вы запісалі больш 700 расказаў, а ў кнігі ўвайшло менш палавіны. Чым Вы кіраваліся ў адборы?**

— Перш за ўсё тым, што гэта павінен быць мастацкі твор. А адбор матэрыялу ішоў чыста інтуітыўна. Галоўным было знайсці неабходную танальнасць для напісання кнігі. З 9 тысяч старонак, спісаных у час работы, засталося толькі 400—500. Я шукала тонкую грань паміж плакатам і літаратурай. Кожная споведзь — гэта яшчэ адна праўда, яшчэ адна грань. Вельмі многае значыла дэталь, самая звычайная дэталь. Дзіцячая памяць выхапіла самыя яркія і трагічныя моманты. «Леанід Шакіна, 12 гадоў. Зараз — мастак. Жыве ў Мінску: «Расстралялі чатырнаццаць чалавек і пачалі закопваць яму. А мы... стаялі і глядзелі. Як закідваюць зямлёй, як утоптваюць зямлю ботамі. А зверху яшчэ рыдлёўкамі папляскалі, каб было прыгожа...»

Вось такія пранізлівыя, псіхалагічна вострыя дэталі — на кожнай старонцы. Хтосьці скажа: «Навошта гэты натуралізм». Але ж так было, так гавораць самі сведкі.

**— Што дала Вам асабіста работа над кнігамі?**

— Матэрыял гэты выпрацаваў у мяне слых на фальш. Я зразумела, што такое чалавек. Я нібы «прайшла» вайну і ўбачыла яе новыя жудасныя бакі. Вось гэта — галоўнае.

**Гутарку правяла**
**В. РАЖАНЕЦ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

**АЎТОГРАФ С. АЛЕКСІЕВІЧ:**
**«Чытачам «Беларускага універсітэта»:**
**— Я пішу пра тое, які цудоўны і вялікі можа быць чалавек. І кожны з нас таксама!»**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

12 снежня 1985 г.
Зак. 3281. АТ 13874.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.